# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ 9 клас Варыянт 2

**Заданне 1.** Пазнайце слова па яго лексічным значэнні і вызначце яго родавую прыналежнасць. Адказы запішыце ў адпаведных слупках табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Узор:*

| Слова | Лексічнае значэнне | м. р. / ж. р. |
|---|---|---|
| **запіс** | *Пісьмовая перадача, змест чаго-н.; запісаныя на паперы думкі, заўвагі і пад.* | *м. р.* |

*Словы для даведкі:* залеж, квецень, медаль, педаль, продаж, россып.

| Слова | Лексічнае значэнне | м. р. / ж. р. |
|---|---|---|
| | Знак у выглядзе металічнага кружка з рэльефным адбіткам і надпісам для ўзнагароды за асаблівыя заслугі | |
| | Гандаль, тавараабарот | |
| | Нажны рычаг у машынах, механізмах і пад. | |
| | Што-н. рассыпанае ў вялікай колькасці | |
| | Месца залягання карысных выкапняў | |
| | Кветкі (на дрэвах, раслінах, лузе і пад.) | |

**Заданне 2.** Слова можа мець адну, дзве, тры прыстаўкі. А можа не мець іх зусім. Размяркуйце наступныя словы па асобных слупках табліцы. У кожным з прапанаваных слоў вызначце прыстаўку (прыстаўкі).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Сподак, схаваць, абяздолець, даказаць (тэарэму), паселішча, нязвыкла, выдатніца, давыбраць, недаспаць, выбары, падлетак, вызваліцель.

| Словы без прыстаўкі | Словы з адной прыстаўкай | Словы з дзвюма прыстаўкамі |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 3.** Падбярыце да шасці з сямі слоў, пададзеных у табліцы, такія словы з наступнага абзаца, каб ад асноў кожнай пары можна было ўтварыць неаказіянальныя складаныя назоўнікі або прыметнікі (г. зн. яны павінны змяшчацца ў нарматыўных слоўніках літаратурнай мовы). Упішыце па шэсць падабраных і ўтвораных слоў у адпаведныя ячэйкі табліцы. Насупраць незапатрабаванага слова пастаўце ў другім і трэцім слупках прочырк.

*Гадаваць, здабыць, сцвярджаць, утвараць, хвост, якасць.*

**Заўвага:** аснова слова з першага слупка павінна ў складаным слове ісці першай, а ў другім слупку ніводнае слова не павінна паўтарацца.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Узор:*

| | | |
|---|---|---|
| *кніга* | *насіць* | *кніганоша* |

| | | |
|---|---|---|
| *авечка* | | |
| *вугаль* | | |
| *высокі* | | |
| *жыццё* | | |
| *закон* | | |
| *кароткі* | | |
| *слова* | | |

**Заданне 4.** Адносіны да прыроды – адзін з паказчыкаў агульнай культуры чалавека. Раскрыйце дужкі і размясціце назвы паняццяў, звязаных з экалогіяй і экалагічнай культурай грамадства, у адпаведных слупках табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

(глебава)гідралагічныя ўмовы
(ландшафтна)рэкрэацыйная тэрыторыя
(сельска)гаспадарчыя культуры
(усходне)еўрапейскія масівы
(холада)любныя жывёлы
(шырака)лістыя лясы

| **Злітнае напісанне** | **Напісанне праз дэфіс** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 5.** У заданні ўсе прыклады згрупаваны па пэўнай граматычнай прымеце. Але ў кожнай групе ёсць лішні прыклад. Знайдзіце і запішыце яго нумар у адпаведным слупку. Патлумачце свой выбар.

*Узор:*

| **Прыклады** | **Трэцяе лішняе (нумар)** | **Тлумачэнне** |
|---|---|---|
| *I. Від сувязі паміж словамі ў словазлучэнні:*<br>1) вясёлыя канікулы;<br>2) вывучыць верш;<br>3) мая кніга. | 2 | 1 і 3 – дапасаванне;<br>2 – кіраванне. |

| **Ілюстрацыйны матэрыял** | **Трэцяе лішняе (нумар)** | **Тлумачэнне** |
|---|---|---|
| *I. Від сувязі паміж словамі ў словазлучэнні:*<br>1) загад маўчаць;<br>2) моцна рызыкаваць;<br>3) чырвоны ад сораму. | | |
| *II. Тып выказніка:*<br>1) Народная песня багатая на жанры (А. Бачыла).<br>2) Розніца ва ўзросце не мела ніякага значэння (А. Бачыла).<br>3) На кожным кроку гітлераўцам аказвалі жорсткае супраціўленне (В. Вольскі). | | |
| *III. Аднасастаўныя і двухсастаўныя сказы:*<br>1) З невясёлымі думкамі апынуўся ля сваёй хаты (Я. Галубовіч).<br>2) Сёння тут музей і канцэртная зала з магутным арганам (Н. Гальпяровіч).<br>3) З драўніны елак вырабляюць скрыпкі і іншыя музычныя інструменты (М. Капыловіч). | | |
| *IV. Віды аднасастаўных сказаў:*<br>1) Гаспадароў дома не было (Я. Галубовіч).<br>2) Не чуваць ні стрэлу, ні выбухаў (В. Быкаў).<br>3) Вадзе ахвяравалі таксама каменныя сякеры, ежу, кветкі (Л. Дучыц). | | |

**Заданне 6.** Абапіраючыся на прыведзеныя ў левым слупку табліцы дзеясловы, складзіце шэсць фразеалагізмаў. Для гэтага выкарыстайце прапанаваныя ў наступным абзацы словы, ужываючы іх у форме патрэбнага склону і ліку. Запішыце складзеныя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *агарод, вуха, далёка, з, за, казёл, можна, на, не, пад, палец, плячо, трэба, у (ў), увага.*

| | | |
|---|---|---|
| *звальвацца* | ‘пераставаць абцяжарваць каго-н.’ | |
| *пералічыць* | ‘вельмі мала’ | |
| *прымаць* | ‘улічваць што-н., надаючы значэнне чаму-н.’ | |
| *прыцягваць* | ‘неапраўдана, беспадстаўна выкарыстоўваць што-н. у якасці доказаў’ | |
| *пусціць* | ‘дапусціць каго-н. туды, куды ён імкнецца і дзе ён найбольш небяспечны’ | |
| *хадзіць* | ‘лёгка назваць (прыклад, факт і пад.), каб пацвердзіць што-н.’ | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Мотыльки летели со всех сторон на свет и падали, обожженные, на скатерть. Но еще где-то в мире была луна. И это выяснилось лишь тогда, когда Петя и Зоя очутились в самой глубине сада. Сквозь дыры в листве проникал такой яркий и такой волшебный лунный свет, что даже белки глаз девочки отливали раскаленной синевой, и такой же синевой блеснула в кадке под старым абрикосом темная вода, в которой плавала чья-то игрушечная лодочка. *(По В. Катаеву.)*

**Заданне 8.** Уважліва прачытайце прапанаваны верш і пагадзіцеся ці не пагадзіцеся з прапанаванымі сцверджаннямі, паставіўшы + (“плюс”) у адпаведным слупку.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

***

Ёсць на свеце мой алень,
Ёсць і гэткае маленне:
Будзь заўсёды у аленя,
Цёмны мох і светлы дзень!

Вы, разумныя браты, –
Я і сам страляць умею, –
Дайце жыць майму аленю
Пад галінкай дабраты.

Вось у цішыні лясоў
Ліст трапеча счырванелы.
Можа, гэта страх аленя
Тут асінкаю ўзышоў?

Я іду, іду між дрэў
Па асінавай алеі.
Мне пабачыць бы аленя...
Зноў я чую блізкі стрэл.

*Аляксей Пысін*
*1972*

| № п.п. | Сцверджанні | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1 | Верш адносіцца да інтымнай лірыкі | | |
| 2 | Верш напісаны 4-стопным харэем | | |
| 3 | Верш мае перакрыжаваную рыфмоўку | | |
| 4 | У першым радку выкарыстаны эпітэт | | |
| 5 | У вершы адсутнічае лірычны герой | | |
| 6 | Аўтар выкарыстаў анафару | | |
| 7 | Верш падзелены на строфы | | |
| 8 | Сярод асноўных тэм твора можна назваць тэму пошуку сэнсу жыцця і экалагічную | | |
| 9 | Адной з сінтаксічных фігур у вершы з’яўляецца інверсія | | |
| 10 | У вершы чаргуюцца мужчынскія і жаночыя рыфмы | | |
| 11 | Аўтар прысвяціў верш падзеям аварыі на Чарнобыльскай АЭС | | |
| 12 | Сярод іншых сродкаў мастацкай выразнасці аўтар выкарыстаў параўнанне | | |

**Заданне 9.** У прыведзеным пераліку элементаў кожнага мастацкага твора адзін названы памылкова. Знайдзіце яго і запішыце ў адпаведным слупку табліцы. Успомніце і запішыце аўтараў твораў.

*А) **“Вечар”**: пералік асоб, рэмаркі, пралог, дыялогі, маналогі*

*Б) **“Паром на бурнай рацэ”**: экспазіцыя, завязка, апісанне месца падзей, падзел на акты*

*В) **“Губаты”**: эпіграф, завязка, дыялогі, падзел на часткі, развязка*

*Г) **“Тарас на Парнасе”**: перасячэнне рэальнага і алегарычна-ўмоўнага, кульмінацыя, прысвячэнне, падзел на часткі*

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| Аўтар | Назва твора | Лішні элемент |
|---|---|---|
| | *“Вечар”* | |
| | *“Паром на бурнай рацэ”* | |
| | *“Губаты”* | |
| | *“Тарас на Парнасе”* | |

**Заданне 10.** У 2024 годзе споўнілася 80 гадоў з дня першай пастаноўкі п'есы Янкі Купалы "Паўлінка".

Уявіце сабе, што вы прымаеце ўдзел у стварэнні трэйлера да фільма па гэтай п'есе. Ваша задача – адабраць тры найбольш яркія эпізоды (павінны быць у тэксце твора), якія будуць уключаны ў трэйлер гэтага фільма, патлумачыць свой выбар і напісаць закадравы тэкст (да 200 слоў). У тэксце неабходна прадставіць асноўных герояў, расказаць, пра што фільм, але пры гэтым захаваць інтрыгу. Памятайце, што тэкст пажадана звязаць з выбранымі эпізодамі.

***Для даведкі:*** *трэйлер – кароткі відэаролік, які складаецца з найбольш відовішчных фрагментаў фільма і выкарыстоўваецца для анонсу або рэкламы.*

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Апісанне эпізоду | Тлумачэнне выбару |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

***Закадравы тэкст***

______________________________________________________________

______________________________________________________________